Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина»

# ИСТОРИЧЕСКАЯ НАУКА:
# ДОСТИЖЕНИЯ, ПРОБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТИВЫ

Электронный сборник материалов
XV Республиканской научно-практической конференции студентов,
магистрантов и молодых ученых

Брест, 21 апреля 2023 года

Брест
БрГУ имени А. С. Пушкина
2023

© УО «Брестский государственный
университет имени А. С. Пушкина», 2023

Об издании – 1, 2

<u>1 – сведения об издании</u>

УДК 94(476)(082)+099.5
ББК 63.3(0)я43

*Редакционная коллегия:*
заведующий кафедрой всеобщей истории БрГУ имени А.С. Пушкина,
кандидат исторических наук, доцент **Е. И. Пашкович**
старший преподаватель кафедры истории славянских народов, заместитель декана по научной работе исторического факультета БрГУ имени А.С. Пушкина
**В.Ю. Пилипович**
доцент кафедры всеобщей истории БрГУ имени А.С. Пушкина,
кандидат исторических наук, доцент **Е. С. Розенблат,**
доцент кафедры всеобщей истории БрГУ имени А.С. Пушкина,
кандидат исторических наук, доцент **Л.В. Харичкова**

*Рецензенты:*
доцент кафедры истории Беларуси нового и новешего времени,
Белорусского государственного университета,
кандидат исторических наук, доцент **Т. В. Лисовская**
доцент кафедры истории Беларуси БрГУ имени А. С. Пушкина,
кандидат исторических наук, доцент **Т.П. Савчук**

**Историческая** наука: достижения, проблемы, перспективы [Электронный ресурс] : электрон. сб. материалов XV Респ. науч.-практ. конф. студентов, магистрантов и молодых ученых, Брест, 21 апр. 2023 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол. Е. И. Пашкович [и др.]. – Брест : БрГУ, 2023. – 201 с. – Режим доступа: http://rep.brsu.by/handle/123456789/9843.

В сборник включены доклады, посвященные широкому кругу актуальных проблем истории Беларуси, всемирной истории, исторической памяти, устной истории, урбанистики, этнографии и археологии.

Адресуется обучающимся учреждений образования, преподавателям, а также работникам сферы культуры и государственного управления.
Разработано в PDF-формате.

**УДК 94(476)(082)+099.5**
**ББК 63.3(0)я43**

Текстовое научное электронное издание

Системные требования:
тип браузера и версия любые; скорость подключения к информационно-телекоммуникационным сетям любая; дополнительные надстройки к браузеру не требуются.

© УО «Брестский государственный
университет имени А. С. Пушкина», 2023

## СОДЕРЖАНИЕ

### АРХЕОЛОГИЯ. ЭТНОГРАФИЯ. АНТРОПОЛОГИЯ

**Ткачёва М.В.** К вопросу об этнической принадлежности племен колочинской культуры.......... 7
**Кананові̇ч В.В.** Археалагічнае вывучэнне палацава-паркавага комплекса Косаўшчыны ў XIX–XXI стст.......... 11
**Васько А.Н., Саевец А.С.** Археологическое исследование урочища Марочевщина в XIX – нач. XXI вв.......... 15
**Селях А.А.** Камунікатыўныя практыкі заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у другой палове XX стагоддзя.......... 21
**Овсеенко Т.С.** Детские развлечения в контексте сельской повседневности Брестчины (1930–2000-е гг.).......... 26
**Ігнацюк А.А.** Штодзённасць і дасуг: арганізацыя вольнага часу сялян заходнепалескай вёскі ў 1930–1950-я гг. (на прыкладзе в. Балоты Кобрынскага раёна).......... 30
**Павлюковец М.Г.** Повседневность городской семьи 2-й пол. XX в.: взгляды на брак и супружеские отношения в контексте социокультурного пространства г. Бреста.......... 36
**Лебядзеўская Я.В.** Знахарства на Лунінетчыне: першы вопыт палявых даследаванняў.......... 43
**Сакович М.Л.** Дохристианские религиозные представления восточных славян.......... 46

### РЕГИОНАЛЬНАЯ ИСТОРИЯ

**Чернякевич С.М.** Украинское национальное движение на Брестчине в начале XX в. .......... 50
**Церахаў Я.У.** Польскі друк Мінска ў 1917 г. .......... 53
**Исакаў С.А.** Брэст ва ўмовах польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. .......... 56
**Сарапин А.А.** Социальная группа "восточников" в городе Бресте (1939–1945 гг.).......... 61
**Гаўрылюк П.А.** Настаўнікі горада Брэста ў 1941–1942 гадах.......... 64
**Донцова С.А.** Развитие учреждений здравоохранения во второй половине 1960 – первой половине 1970-х гг. (на примере Каменецкого района Брестской области).......... 68
**Лазаревич Е.А.** Гродненская еврейская община: сохранение исторической памяти.......... 71
**Шедько Е.А.** Участие города Бреста в побратимском движении городов-побратимов в 1990-е годы.......... 76

## ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ

**Казмерчук М.А.** Яўрэйскае пытанне на беларускіх землях у 1772–1825 гг. ........ 81
**Русецкая У.Д.** Абвастрэнне нацыянальнага пытання ў Заходнім краі Расійскай імперыі (1861–1864 гг.) ........ 86
**Зуев А.В.** Крестьянская реформа 1861 г. в Северо-Западном крае ........ 91
**Брилева Т.И.** Политика ревиндикации на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. ........ 97
**Хомич Д.А.** Правовое оформление воссоединения Западной Беларуси с Белорусской Советской Социалистической Республикой ........ 101
**Саковец Я.С.** Влияние последствий Великой Отечественной войны на общество БССР ........ 106
**Краснюк А.О.** Современное поисковое движение на территории Беларуси и России ........ 110
**Салехова Н.Э.** Из истории азербайджанской диаспоры в Беларуси ........ 113
**Фарино В.В.** Развитие бизнеса в рамках индустриального парка «Великий камень» ........ 118

## ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ. МЕЖДУНАРОДНЫЕ ОТНОШЕНИЯ

**Михаленя Р.В.** Изменения полномочий сената в период принципата Августа ........ 123
**Артюшко Н.А.** К вопросу о роли армии и преторианской гвардии в политической системе Принципата ........ 128
**Розмысл Е.В.** Военный мятеж Георгия Маниака 1043 г. и его значение ........ 131
**Скрундик А.А.** У истоков канадского экологизма: зарождение и развитие движения в защите природы в конце XIX в. – 1970-е гг. ........ 135
**Добролинский Г.В.** Эфективность плакатов Российской империи времен Первой мировой войны в решении пропагандистских задач ........ 140
**Савик И.П.** Роль белфастского соглашения 1998 г. в процессе мирного урегулирования в Северной Ирландии ........ 145
**Семенюк Е.В.** Достижения сотрудничества Беларуси и стран Латинской Америки ........ 149
**Фарино К.В.** Инвестиционные проекты КНР в Республике Беларусь в области транспорта инфраструктуры и логистики ........ 153

## КУЛЬТУРА. РЕЛИГИЯ. ОБЩЕСТВО

**Мысак И.С.** Эволюция куросов в архаический период Древней Греции ... 158
**Ларченко И.К.** К вопросу о положении весталок в общественно-политической структуре Древнего Рима ... 161
**Казмерчук М.А.** Битва при Суассоне 1918 года в массовой культуре на примере компьютерной игры "Battlefield 1" ... 164
**Клімук А.А.** Антырэлігійная палітыка ў дачыненні да праваслаўнай царквы на тэрыторыі сучаснага Камянецкага раёну ў 1945–1964 гг. ... 169
**Мазур А.А.** Политика советской власти к русской православной церкви на территории Беларуси и Брестской области (1953–1964 гг.) ... 172
**Кузьмич А.В.** Влияние медиа на религиозные убеждения среди молодёжи ... 178

## ОБРАЗОВАНИЕ. ИСТОРИЯ ОБРАЗОВАНИЯ

**Макаренко И.А.** Роль школьного образования в концепции "третьего пути" "новых лейбористов" ... 182
**Приступа Т.С.** Способы визуализации учебного материала на уроках истории и обществоведения ... 187
**Чернак П.А.** Особенности конструирования исторической памяти у старшеклассников (на примере учащихся ГУО "Лицей №1 имени А.С. Пушкина г. Бреста") ... 192
**Полоз М.А.** Визуализация в обучении истории на примере Пятой республики во Франции ... 196

УДК 316.77-055.25 (476.4-22) (091)
**А. А. СЕЛЯХ**
Мінск, БДУ
*Навуковы кіраўнік – Т. А. Навагродскі, д-р гіст. навук, прафесар*

# КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ПРАКТЫКІ ЗАХОДНЕПАЛЕСКІХ СЕЛЬСКІХ ДЗЯЎЧАТ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ ХХ СТАГОДДЗЯ

*Артыкул прысвечаны разгляду дзявочых камунікатыўных практык, якія бытавалі ў заходнепалескай вёсцы ў другой палове ХХ стагоддзя. Увага нададзена асаблівасцям кансалідацыі дзяўчат у групы і спецыфіцы іх узаемадзеяння. Праблема асэнсоўваецца праз прызму ўспамінаў жаночага насельніцтва, сабраных аўтарам у сельскіх мясцовасцях Берасцейшчыны.*

Штодзённае жыццё заходнепалескіх дзяўчат было прадстаўлена сукупнасцю культурных, камунікатыўных і забаўляльных практык, якія былі складанай часткай агульнакультурнага ландшафту рэгіёна. У прадстаўленым артыкуле разгледзем пытанне аб формах камунікацыі, гендэрнай сацыялізацыі дзяўчат падлеткавага і юнацкага ўзросту.

Дастаткова яркую праяву ў пытанні фарміравання сяброўскіх дзявочых груповак традыцыйна мела статусна-ўзроставая стратыфікацыя. Дасягнуўшы адпаведнага ўзросту адбывалася адасабленне дзявочай супольнасці ад старэйшых. З мэтай удзелу ў працоўных (попрадкі, талака), культурных (абрадавыя дзеянні) і дасугавых (вячоркі, танцы) практыках дзяўчаты аб’ядноўваліся ў асобныя групоўкі. Нярэдка, падчас працоўных і забаўляльных мерапрыемстваў да дзяўчат далучаліся хлопцы. Сярод моладзевых суполак, існавалі такія, якія складаліся выключна з дзявочых груп. Прычым памылкова казаць, што ўсе незамужнія дзяўчаты вёскі складалі аднародны калектыў. Палявыя матэрыялы сведчаць, што ўнутры агульнадзявочага калектыву існавала сегрыгацыя па ўзроставай прыкмеце. Гэта было ўласціва як для даваеннай, так і для пасляваеннай вёскі: дзеўкі “на выданні” заўсёды “ганялі” дзяўчат, якія былі малодшыя. З успамінаў наконт арганізацыі моладзевых стасункаў на Століншчыне: “Для проведения досуга на селе молодёжь делилась на 2 группы. Первая – до 15 лет, вторая – с 15 и старше. Собирались вместе в хате хлопцы и девчата. С первой группы никого они к себе не пускали” [5, с. 221]. Жанчыны распавядалі: *“Як малы, то ходять з малымі, а як вырас, з років 15-ті, то на музыку ходыть. Там ужо хлопцы і дівчата”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Данілковіч Я. С., 1923 г. н., в. Судзілавічы, Бярозаўскі р-н, 2018); *“По гуртам збіралыся: 13–15 – одна група, 17 і больш – старша група. Старшые девкі малых одгонялы”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Калодзіч М. І., 1945 г. н., в. Еўлашы, Іванаўскі р-н, 2022); *“Помню*

*танцплощадка была, где магазин, а старшие нас выгоняли: "Марш отсюль, шкарпетки!" Поэтому у нас был свой уголок"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Голуб М. І., 1937 г. н., в. Бронная гара, Бярозаўскі р-н, 2017).

Спецыфічнай групай, адасобленай ад іншых, у вёсцы першай паловы XX стагоддзя была супольнасць "старых" дзяўчат. Дзяўчат, якія не выйшлі замуж да 25–30 гадоў, не прымалі ў кампанію дзяўчаты больш маладога ўзросту: *"Большыя, меншыя, сярэднія і старыя дзевы – 4 гурбы булы по хатах"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Шавель М. І., 1938 г. н., в. Вуглы, Івацэвіцкі р-н, 2022); *"Старыя збіралыся отдельно, бо ек жа вонэ з молодёжжу ходэтымуть, як вонэ вжэ старэмэ шчытаюцца"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Балка П. С., 1930 г. н., в. Лелікава, Кобрынскі р-н, 2018). Рэспандэнткі 1940–1960-х гадоў нараджэння распавядалі, што ў іх моладзевым калектыве не адбывалася адасабленне "старых" дзяўчат ад агульнага кола незамужніх. І сам маркер "старая" зыходзіў у нябыт.

Дзяўчаты рознага ўзросту бавілі вольны час у розных месцах: *"І то былі танцы малых падлеткаў – да 13–14 гадоў і взрослых – 17–20. Взрослые малых не пускалі"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Касцюк В. І., 1940 г. н., в. Лазаўцы, Івацэвіцкі р-н, 2022); *"3–5 на нашу деревню було танцув. Мэншум дівчатам отдельна музыка"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Пашкевіч Я. А., 1942 г. н., в. Спорава, Бярозаўскі р-н, 2022); *"У нас разница с сестрой полтора года была. Но я не смела с ней на танцы пойти. У нас свои вечёрки, а на танцы нет. Я к танцплощадке и близко не подойду"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Кірылюк М. А., 1940 г. н., в. Бельск, Кобрынскі р-н, 2022); *"Ужэ когда дома у когось "музыку" робэлэ, то нас малых ны пускалэ. Мы туды мало попадалэ. А еслі і булэ, то мы на запічку сідымо, бо то разведка, доложать усё"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Ізбіцкай Я. П., 1954 г. н., в. Чаравачыцы, Кобрынскі р-н, 2021).

Старэйшыя дзяўчаты забаранялі малодшым хадзіць на танцы ў клуб. Але абмежаванні толькі распальвалі зацікаўленасць у падлеткаў: *"На дискотеку в клуб запрещалось малым ходить. Тож ходили под окнами заглядывали, как старшие танцуют. Уже дома не интересно было сидеть на печке"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Гузарэвіч В. М., 1963 г. н., в. Новы Двор, Пінскі р-н, 2022). Пытанне наведвання непаўналетнімі танцаў кантралявалася, у тым ліку, школьнымі настаўнікамі: *"Учытеля чогось гонэлы нас, бо мэ малые булэ. Прэдымо в Шэповэчы в клуб, сыдэмо в корчах, бо тут Стёпка був учітель. Чуем дэсь мотоцыкл йіда. А той Сцёпка на мотоцыклі йіздыў. Эхх, побіглы в поле. Сыдымо"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Селях З. П., 1952 г. н., в. Шыповічы, Кобрынскі р-

н, 2021). Па ўзроставым прынцыпе арганізоўваліся школьныя вечары: розны час правядзення для малодшых і старэйшых школьнікаў.

Разам з пераходам дзяўчат-падлеткаў у юнацкі перыяд жыцця адбываліся змены ў іх паводзінах, інтарэсах і самапрэзентацыі. Перыяд сталення дзяўчыны суправаджаўся новымі, раней невядомымі вопытамі (першая менструацыя, першыя пацалункі, абдымкі, пабачанні), якія з аднаго боку былі таемнымі, а з іншага – агульнымі для многіх дзяўчат, што садзейнічала кансалідацыі дзявочай супольнасці. Адказы на многія пытанні, у тым ліку, інтымнага плана, атрымоўвалі падчас унутрыдзявочых камунікацый. Як зазначалі рэспандэнткі: “од групы дывок всё узнавалы”, “больш од дівчат толкуеш, чым од мамы”, “всё в діалоге, в групі, в прямом обшченіі було”.

На этапе дзявоцтва дзяўчаты пачынаюць надаваць большую ўвагу свайму вонкаваму выгляду (прычоска, уборы, гігіена). Дзеля таго, каб “намарафеціцца”,часцяком, збіраліся групамі. Успаміны сведчаць, што ў 1960–1970-я гады погляды старэйшага пакалення на пытанне выкарыстання касметыкі заставаліся кансерватыўнымі: *“Вжэ дэсь позбіраемся всі дівчата в кучі, і красымось. То туш дэсь якая була, то очі бровы одна однэй красымо, шчокі. А пазура…я помню толькі одного накрасыла, то мні баба Олька як дала, і всё, ны разу пазуры ны красыла”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Селях З. П., 1952 г. н., в. Шыповічы, Кобрынскі р-н, 2021); *“Ховалы косметіку. Дасы грошы – дэ хто купыть. Понакрашваемся бы обезьянкы”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Ксёнда Н. І., 1960 г. н., агр. Моталь, Іванаўскі р-н, 2022); *“До девчат бігалы красітыся. Тая вміе прычоску робыты, тая – косы надыраты, тая – красэты”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Ксёнда М. П., 1975 г. н., агр. Моталь, Іванаўскі р-н, 2022).

У вясковым асяроддзі 60–80-х гадоў XX стагоддзя ствараліся спецыфічныя моладзевыя, у тым ліку, дзявочыя групоўкі, аб’ядноўваючым фактарам для якіх, найчасцей, выступалі пэўныя музычныя перавагі, густавыя захапленні. Дзяўчаты знешне (прычоска, адзенне) імкнуліся быць падобнымі на сваіх куміраў. Жанчыны распавядалі, што ўсе дзяўчаты на вёсцы імкнуліся выглядаць прыкладна аднолькава. Модныя трэнды ахоплівалі ўсю моладзь, паколькі усе вучыліся ў адной школе, хадзілі ў адзін клуб: *“Лосины яркие, юбки-резинки, мальвины-джинсы. Все были одинаковые…Начёсы делали, макияжи яркие”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з Маліч А. Н., 1983 г. н., агр. Тышкавічы, Іванаўскі р-н, 2022).

Французскі этнограф .М. Мосс вывучаў праблему засваення чалавекам свайго цела шляхам “прэстыжнага пераймання” ад сацыяльных аўтарытэтаў пэўных “тэхнік”. У залежнасці ад розных прыкмет, сярод якіх былі такія як узрост і пол, даследчык выдзяляў, у тым ліку, тэхнікі юнацтва

[4, с. 304–308]. Абапіраючыся на канцэпцыю М. Мосса, можна зрабіць выснову аб тым, што, уваходзячы ў дзявочую супольнасць, наладжваючы ў ёй дачыненні, дзяўчына пераймала і засвойвала пэўныя тэхнікі юнацтва, да якіх мы можам аднесці наступныя: тэхніка самапрэзентацыі, самапраявы, упрыгожвання, догляду за тварам і целам і г. д.

Варта зазначыць, што сетка міждзявочых камунікацый доўгі час абмяжоўвалася прасторай роднай вёскі. Адносная нешматлікасць дзяўчат з адной мясцовасці вызначала "вузкасць круга, цеснату сацыяльнай прасторы" [3, с. 64]. Выезд у горад на вучобу, працу, працоўныя міграцыі ў іншыя краіны, актывізацыя якіх адбылася, пачынаючы прыкладна з 1960-х гадоў, садзейнічалі пашырэнню іх сяброўскіх колаў і засвойванню новых форм камунікацыі. Працяг стасункаў з новымі сябрамі, з якімі знаёміліся на "сезоне", вучобе, святочных мерапрыемствах, адбываўся далей у перапісцы. Рэспандэнткі ўспаміналі, як пісалі пісьмы сваім сябрам здалёку: *"Как на сезон езділі – знакомілімь, пісалі пісьма, фотографіі пересылалі. По газетам знакомілісь "Зорька", "Піонер Беларусі"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Капуза Л. М., 1961 г. н., в. Сварынь, Драгічынскі р-н, 2022); *"Пісьма хлопцы і дзяўчаты пісалі. На свадьбе пазнаёміцца маглі"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Ксёнда Н. І., 1960 г. н., в. Тышкавічы, Іванаўскі р-н, 2022). Папулярнасцю карысталіся паштовыя карткі, якія дасылалі на "доўгую памяць" сябру.

Значнае месца для дзяўчат юнацкага ўзросту мела паняцце асабістай прасторы. У групоўках, альбо сам-насам дзяўчаты знаёміліся з прадуктамі масавай культуры (часопісы, касеты, постэры, налепкі і г. д.). Пры гэтым, важна зазначыць, што дзяўчаты былі не проста пасіўнымі спажыўцамі медыа, але і вытворцамі культурных прадуктаў, а іх пакой з'яўлялася своеасаблівай "прасторай для творчасці" [2]. Тут адбывалася фарміраванне спецыфічнай дзявочай культуры. Дзявочая культура, як зазначыў С. Б. Барысаў, уяўляе сабой кантынуум дзявочых практык, якія вырашаюць задачы палавой сацыялізацыі дзяўчат [1]. Адной з папулярных практык у штодзённым жыцці сельскіх дзяўчат у другой палове XX ст. была рукапісная культура, прадстаўленая шырокай жанравай разнастайнасцю (анкеты, альбомы, песеннікі, дзённікі, сшыткі пажаданняў. Ва ўсе часы пісьмовы фальклор адлюстроўваў характэрныя для падлеткавага ўзросту ўяўленні пра каханне і сяброўства ў адпаведнасці з культурнымі рэаліямі часу. Тэматыка вершаў, песен, аповедаў, афарызмаў, зафіксаваных у сшытках, указвае на той факт, што пісьмовыя практыкі дзяўчат ігралі значную ролю ў дэтабуацыі інтымнага жыцця і ажыццяўлялі функцыю палавой сацыялізацыі.

Такім чынам, для заходнепалескай вясковай штодзённасці другой паловы XX ст. характэрна існаванне асобнай дзявочай культуры. Дзяўчаты

перашлюбнага ўзросту ўяўлялі сабой асобную сацыяўзроставую групу са спецыфічнымі формамі дачыненняў і самапраяў. Вызначальнымі крытэрамі прыналежнасці да пэўных дзявочых супольнасцяў былі ўзрост і незамужні статус. У межах адной вёскі, як правіла, існавалі дзве групы дзяўчат. Дзяўчаты падлеткавага ўзросту групаваліся асобна ад старэйшых і мелі адрозныя ад іх інтарэсы. Час для гуляняў і забаў у падлеткаў строга абмяжоваўся бацькамі, настаўнікамі. Жыццё дяўчат юнацкага ўзросту было больш вольным і мела свае асаблівасці. Праблема першай закаханасці, спецыфіка палавога сталення, музычныя захапленні выступалі значным фактарам кансалідацыі дзяўчат у групы. У калектыве адбывалася абмеркаванне трэндаў ў галіне моды і прыгажосці, разважанні аб інтымных перажываннях – праблемамі, актуальнымі для сваёй узроставай групы. Пасля таго, як дзяўчына мяняла сваю групавую прыналежнасць з моладзевай незамужняй у супольнасць дарослых, сямейных, надыходзіла сканчэнне яе “дзявочага” перыяду жыцця. Нявеста, маладуха не магла ўжо браць удзел у “дзявочых”, у тым ліку, камунікатыўных практыках, а незамужнія сяброўкі не падзялялі з ёй “жаночых”.


1. Борисов, С. Б. Латентные феномены культуры (опыт социологического исследования личных документов девушек) [Электроны рэсурс] / С. Б. Борисов. – Рэжым доступу: https://cheloveknauka.com/v/504314/a?#?page=1. – Дата доступу: 31.03.2023.

2. Булатова, Е. И. Исследования девичества. Ретроспективный анализ [Электроны рэсурс] / Е. И. Булатова. – Рэжым доступу: https://chelovek.iphras.ru/article/view/2454. – Дата доступу: 31.03.2022.

3. Головин, В. В. Подростковые сообщества в современной России / В. В. Головин, М. Л. Лурье // Мальчики и девочки: реалии социализации: сб. статей. – Екатеринбург: изд-во Уральского ун-та, 2004. – С. 45–67.

4. Мосс, М. Общества. Обмен. Личность: труды по социальной антропологии / М. Мосс. – Москва : Книжный дом Университет, 2014. – 413 с.

5. Чарнякевіч, І. С. Версія мінулага вачамі палескага жыхара, прачытаная яго ўнучкай / І. С. Чарнякевіч // Tożsamość – język – rodzina : z badań na pograniczu słowiańsko-bałtyckim. – 2008. – С. 217–232.


*К содержанию*